У Гомлі асудзілі мужчыну, які «зліваў» персанальныя дадзеныя міліцыянтаў тэлеграм-каналам

25.11.2021



Фота мае ілюстратыўны характар

Гамяльчуку Уладзіміру К. (імя на просьбу сваякоў зменена) прысудзілі 3 месяцы арышту і 13500 рублёў кампенсацыі маральнай шкоды пацярпелым ад яго дзеянняў сілавікам. Усяго ў справе іх 28 чалавек. Такое рашэнне прыняў суд Савецкага суду Гомля (суддзя **Лагуновіч**).

Мужчыну прызналі вінаватым у наўмысным распаўсюдзе інфармацыі аб прыватным жыцці іншых асоб без іх згоды, а таксама незаконным яе распаўсюдзе, што пацягнула за сабой "прычыненні маральнай шкоды правам, свабодам і законным інтарэсам грамадзянаў" (арт.203 КК РБ)

Абвінавачаны малады мужчына – былы міліцыянт які меў доступ да асабістай інфармацыі калегаў, бо да 2019 года працаваў у міліцыі. З-за нейкага канфлікту з кіраўніцтвам яго звольнілі. Доўгі час ён не мог уладкавацца на працу, бо працадаўца даваў яму кепскую характарыстыку. Даводзілася займацца падпрацоўкамі.

Калі пачаліся паслявыбарчыя пратэсты ў мінулым годзе, Уладзімір К. браў у іх актыўны ўдзел. Пасля таго як Маршы пратэсту спыніліся, малады мужчына звязаўся з адміністратарамі некалькіх тэлеграм-каналаў і прапанаваў персанальную інфармацыю пра сваіх былых калегаў з Савецкага АУСу.

Уладзімір К. быў затрыманы ў маі бягучага году, але да суду знаходзіўся на волі пад падпіскай аб нявыездзе і належных паводзінах.

Як следчым стала вядома інфармацыя пра «злівы» асабістай інфармацыі сілавікоў, абвінавачаны не ведае. На яго кампутары і тэлефоне ўся адпаведная інфармацыя была надзейна выдалена і ён адпісаўся ад усіх тэлеграм-каналаў пратэстнай скіраванасці.

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Травень 2021

СВАБОДА СХОДАЎ

Тры гады "хатняй хіміі" — за знаходжанне на праспекце і парушэнне працы "Мінсктранса"

Дзяржабвінавачанне запрасіла два гады калоніі для палітвязня Івана Багдзевіча

Што адбывалася ў судах па адміністрацыйных справах цягам тыдня?

Ці можна трапіць у калонію, калі своечасова не зняў бчб-сняжынкі з акна? Юрыст расказвае пра змены ў Крымінальным кодэксе

СМЯРОТНАЕ ПАКАРАННЕ

Сястра асуджанага да смяротнага пакарання Віктара Паўлава: "Яго хутчэй за ўсё расстралялі"

Андрэй Палуда: "Пакуль няма сістэмных зменаў, новыя прысуды і расстрэлы могуць адбыцца ў любы момант"

Вярхоўны суд не задаволіў апеляцыйную скаргу асуджанага да смяротнага пакарання Віктара Скрундзіка

Асуджаных да смерці братоў Косцевых памілавалі

Пацярпелыя сілавікі тлумачылі ў судзе, што пасля апублічвання іх персанальных дадзеных, яны атрымлівалі тэлефанаванні на мабільныя тэлефоны. Пры чым, часта тэлефанавалі з замежных нумароў. Як правіла, пацярпелыя сілавікі на тэлефанаванні не адказвалі. Яны таксама атрымлівалі смскі, дзе ў іх запытваліся ці добра яны спяць па начах і ці не пакутваюць ад згрызотаў сумлення.

Пацярпелыя прасілі суд спагнаць з абвінавачанага розныя сумы кампенсацый маральнай шкоды. Напрыклад, міліцыянт **Аўсяннікаў** хацеў атрымаць 2 тыс. рублёў. Хаця яго імя і прозвішча на некалькіх тэлеграм-каналах былі напісаны з памылкамі, а іншай асабістай інфармацыі там наогул не было.

Абвінавачаны Уладзімір К. прызнаў усе зыскі аб маральнай шкодзе, у здзейсненым раскаяўся, перад сілавікамі выбачыўся.

Уладзімір бараніў сябе сам, адваката не наймаў.

Прысуд не ўступіў у законную сілу і можа быць абскарджаны. Невядома ці збіраецца абвінавачаны мужчына гэта рабіць.

Аўтар **Ганна Кавальчук**

Фота мае ілюстратыўны характар

Гомельская вясна

ВІДЭА



БЛОГІ



ЛЕАНІД СУДАЛЕНКА

ЯК Я НЕ СТАЎ УДЗЕЛЬНІКАМ НАРОДНАГА "ХУРАЛА" ЦІ ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ!



ЛАРЫСА ШЧЫРАКОВА

Як прайшла спецаперацыя ГУБАЗіК па пошуку брудных майткоў у журналісткі ці кароткая гісторыя аднага ператрусу

НАВІНЫ ПАРТНЁРАЎ

07.04.2023 Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе «Вясна»

23.03.2023 Зняў двух п'яных расейскіх вайскоўцаў – трапіў пад пераслед, але здолеў збегчы радыё «Свабода»

07.03.2023 Ксенія Луцкіна перахварэла ў калоніі на двухбаковую пнеўманію «Народная воля»

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА Ў СВЕЦЕ

08.08.2022 Пошта ЗША спыніла адпраўленні ў Беларусь


26.07.2022 «Інфармацыя пра маё затрыманне нават мяне шакавала»: ураджэнца Гомельшчыны ўжо тры месяцы трымаюць у ІЧУ ў Расеі

23.07.2022 У Польшчы знік 18-гадовы хлопец з Калінкавічаў

02.03.2023 У палітзняволенай журналісткі Ірыны Слаўнікавай істотна пагоршыўся зрок БАЖ

14.07.2022 У Кіеве заявілі аб імавернасці ўзброеных правакацый у памежных з Украінай раёнах Гомельшчыны і Берасцейшчыны

САЦЫЯЛЬНЫЯ СЕТКІ



ПАРТНЁРЫ

Радыё Свабода · Народная Воля · ВЯСНА праваабарончы цэнтр · kamunikat · Наша Ніва · Белорусский документационный центр · Центр стратегической тяжбы

Праваабарончыя сайты: Брэст Віцебск Гародня Магілёў

© 2023 Гомельская вясна
stryzhakandrej@gmail.com | sutiajnik@gmail.com